**А. А. Рагойша**

# Да пытання аб нумарах Рэспубліканскіх алімпіяд па хіміі

Як вядома, ужо доўгі час Рэспубліканскія алімпіяды па хіміі не маюць парадкавых нумароў. Паспрабуем аднавіць іх нумарацыю на падставе ўскосных дадзеных і некаторых дакументаў, даступных нам.

М.Д.Рэшэтава і С.С.Чуранаў сцвярджаюць [1], што:
а) першыя рэспубліканскія алімпіяды ў некаторых рэспубліках былога СССР, у тым ліку, у Беларусі, адбыліся ў 1963 г.;
б) пасля 1967 г., з пачаткам Усесаюзных алімпіяд, амаль усе рэспубліканскія алімпіяды спынілі сваё існаванне, бо каманды на Усесаюзную алімпіяду фарміраваліся па выніках абласных этапаў;
в) правядзенне рэспубліканскіх алімпіяд аднавілася ў 1975 г.

Дакладнасць пункта (б) для Беларусі на перыяд 1972-74 гг. пацвярджае А.Ф.Сялевіч [2].

У адпаведнасці з дакументам [3], у 1967 г. у Беларусі Рэспубліканская алімпіяда яшчэ праводзіліся (паралельна з Усесаюзнай) і несла нумар VI:



УЗНАГАРОДЖВАЕ

РАГОЙШУ АЛЯКСАНДРА АНТОНАВІЧА,
вучня 9 класа сярэдняй школы № 14 гор. Гродна - пераможца VI Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў па хіміі.

Міністр асветы Беларускай ССР

„4“ красавіка 1967 г.

Ёсць меркаванне [4], што Рэспубліканская алімпіяда адбывалася і ў 1968 г.

У загадах па Міністэрству асветы [5,6] маюцца пункты аб правядзенні Рэспубліканскіх алімпіяд па хіміі, а нумары спаборніцтваў прыведзены ў яўнай форме: XIV - у 1980 годзе і XVII - у 1983 годзе:

6. Провести XIV Республиканскую олимпиаду по физике, математике и химии в 1980 году в следующие сроки:
школьные (I этап) - в декабре 1979 г.
районные (городские)(IIэтап) - в январе 1980 г.
областные (Минскую городскую)(IIIэтап) - в феврале 1980 г.
Республиканскую - с 26 по 29 марта 1980 г.

5. Провести XVII республиканскую олимпиаду школьников по физике, математике, химии и русскому языку в следующие сроки:
школьные (I этап) - в ноябре 1982 года;
районные /городские/ (II этап) - в декабре 1982 года;
областные /Минскую городскую/ (III этап) - в январе 1983 года;
республиканскую - с 27 по 30 марта 1983 года.

Калі дапусціць, што алімпіяды праводзіліся штогадова, атрымліваем наступную схему нумарацыі, якая ў цэлым не супярэчыць літаратурным дадзеным (у табліцы цёмна-сінім колерам адзначаны кропкі найвышэйшай дакладнасці, на якіх грунтавалася ўся экстрапаляцыя):

| | 1962 | 63 | 64 | 65 | 66 | **67** | **68** | 69 | 70 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | **6** | **7** | 8 | - |
| 1971 | 72 | 73 | 74 | 75 | 76 | 77 | 78 | 79 | **80** |
| - | - | - | - | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | **14** |
| 1981 | 82 | **83** | 84 | 85 | 86 | 87 | 88 | 89 | 90 |
| 15 | 16 | **17** | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 1991 | 92 | 93 | 94 | 95 | 96 | 97 | 98 | 99 | 2000 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | 32 | 33 | 34 |
| 2001 | 02 | 03 | 04 | 05 | 06 | 07 | | | |
| 35 | 36 | 37 | 38 | 39 | 40 | 41 | | | |

Высновы.
У 2008 г. у нашай краіне будзе праходзіць заключны этап 42-й Рэспубліканскай алімпіяды па хіміі.

Літаратура.

1. M.D.Reshetova, S.S.Churanov. History of Mendeleev Olympiads // Chemical Education in Russia. M., 2007. P. 84-93.
2. A.F.Selevich. Private communication. 2007.
3. Дыплом VI Рэспубліканскай алімпіяды па хіміі 1967 г.
4. А.А.Рагойша. Цьмяныя ўспаміны. 2007.
5. Приказ Министерства просвещения БССР № 156 от 11 июля 1979 г.
6. Приказ Министерства просвещения БССР № 134 от 9.07.1982 г.